# УСТУПНАЕ СЛОВА

Ва ўсе часы навука і практыка крочылі побач. Першая асвятляе новыя далягляды для практычнай дзейнасці ў любой галіне ці сферы грамадскіх адносін, а другая выпрабоўвае на ісцінасць навуковыя канцэпцыі і канкрэтна рэалізоўвае распрацоўкі вучоных. У гэтым сэнсе такая галіна дзейнасці, як мытная справа, перманентна патрабуе новых ідэй і падыходаў, бо рэгуляванне ў сучасных умовах глабалізацыі такой зменлівай і кан'юнктурнай сферы, як знешні гандаль, ці проста перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу, без выкарыстання сучасных інавацыйных тэхналогій не тое што неэфектыўна, але часам немагчыма.

Асаблівасць мытнай справы – яе мульціпрофільнасць, разнастайнасць, выкарыстоўванне спецыялістамі гэтай сферы дасягненняў самых розных галін ведаў, ад юрыспрудэнцыі і эканомікі да інфармацыйных тэхналогій. Але ажыццяўленне мытных аперацый гэта толькі «вяршыня айзберга», а колькі дасягненняў іншых навуковых дысцыплін застаецца як бы за «кадрам» гісторыі, псіхалогіі, педагогікі, біялогіі, тавараразнаўства, крыміналогіі, менеджмента і шмат іншых.

Выданне зборніка «Актуальныя пытанні мытнай справы» ініцыявана і здзейснена сіламі кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Патрэба ў стварэнні такога навуковага выдання наспела даўно. У нас як раз адчуваецца недахоп навуковай літаратуры, прысвечанай разнастайным аспектам мытнай дзейнасці. Штогоднік будзе прэзентаваць вынікі даследаванняў не толькі супрацоўнікаў кафедры, але і лепшых беларускіх і замежных навукоўцаў у дадзенай сферы. Ён павінен стаць сувязуючым звяном паміж мытнай навукай і мытнай практыкай, пляцоўкай для апрабацыі лепшых мытных даследаванняў, што дасць новы імпульс для іх развіцця ў краіне. У гэтым кірунку рэдакцыйны калектыў навуковага зборніка імкнуўся адразу закласці высокую планку навуковасці публікацый, адпавядаючых патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

Першы выпуск штогодніка дае пэўнае ўяуленне аб сучасным стане развіцця мытнай навукі, вядучых даследніках і навуковых праблемах, існуючых у гэтай сферы. У ім змешчана 20 артыкулаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца практыкі і вучоныя, што працуюць у Белдзяржуніверсітэце, Акадэміі МУС, Ваеннай Акадэміі Рэспублікі Беларусь, Інстытуце нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту (г. Гомель), Беларускім інстытуце правазнаўства, Дзяржаўным мытным камітэце



Zbornik.indd 5 14.12.2010 23:43:49

Рэспубліcі Беларусь, мытне «Мінск-2» і Мінскай рэгіянальнай мытне, прадпрыемстве «Белаэранавігацыя», а таксама ў Акадэміі дзяржаўнай мытнай службы Украіны (г. Днепрапятроўск) і Варшаўскім універсітэце. Сярод аўтараў – Першы намеснік Старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь У. Гошын і рэктар Акадэміі мытнай службы Украіны В. Чанцоў. Тут таксама прадстаўлены вынікі даследаванняў маладых вучоных – аспірантаў і студэнтаў мытнага аддзялення ФМА БДУ.

На старонках зборніка пададзены параўнальны аналіз Мытнага кодэкса Мытнага Саюза Рэспублікі Беларусь, Рэспублікі Казахстана і Расійскай Федэрацыі, які набыў юрыдычную сілу ў ліпені 2010 г., і Мытнага кодэкса Рэспублікі Беларусь 2007 г. Таксама разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі развіцця мытнага заканадаўства і яго трансфармацыі, праблемы развіцця мытнай службы Беларусі, праваахоўная дзейнасць мытных органаў, праблемы мытнага рэгулявання знешнеэканамічнай дзейнасці, мытныя аспекты забеспячэння транзітнага патэнцыялу Беларусі, міжнароднае супрацоўніцтва ў мытнай сферы, у прыватнасці, ў галіне падрыхтоўкі кадраў. Шэраг артыкулаў прысвечаны пытанням айчыннай і замежнай гісторыі мытнай справы. У апошняй рубрыцы зборніка ў храналагічным парадку адлюстраваны важнейшыя падзеі з навуковага, вучэбнага і грамадскага жыцця кафедры і аддзялення мытнай справы факультэта міжнародных адносін БДУ за 2009/10 навучальны год. У апублікаваных матэрыялах падаецца аўтарскае бачанне разглядаемай праблематыкі.

Рэдактарскі калектыў і рэдакцыйная калегія выдання спадзяюцца, што першы выпуск кафедральнага штогодніка выклікае належную ўвагу і рэзананс у шырокіх колах зацікаўленых рознымі аспектамі мытнай дзейнасці, паслужыць справе актуалізацыі і развіцця гэтай важнейшай сферы дзяржаўнага кіравання ў нашай краіне.

*Віктар* ***Астрога****, загадчык кафедры мытнай справы*
*факультэта міжнародных адносін*
*Беларускага дзяржаўнага універсітэта*